Pierasyłka apłačana ryčałtam

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

Nr. 12 (605). Wilnia, Niadziela 10 Sakawika 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

РАБОТНІЦКІЯ СПРАВЫ.

(*Да дыскусіі ў справе абнаўленьня БХД*).

Дагэтуль, калі ўжо даволі даўно адбываецца дыскусія аб абнаўленьні БХД, у «Бел. Крыніцы», не давялося мне спаткаць нічога аб справе работніцкай. Пэўне-ж, надта магчыма, што ўсіх спраў можа набрацца стольκі, што й мейсца для іх у «Бел. Крыніцы» ня хопіць, але так важнай справы, як работніцкая, прапусьціць і шырэй не абгаварыць ніяк няможна.

Праўда, даволі часта сярод беларусаў можна пачуць галасы, што беларускі народ прадусім сялянскі, работнікаў на Беларусі мала ды тыя пераважна вынарадаўленыя і да беларускай нацыі варожыя, а дзеля гэтага беларускія грамадзка-палітычныя арганізацыі прадусім павінны зварачваць увагу не на работнікаў, а на сялянства і на яго апірацца.

Вось-жа гэткі пагляд, калі не цалком, дык у значнай сваей часьці фальшывы. Справа ў тым, што калі капіталізм крыўдзе так-жа й дробнае сялянства, дык у першым парадку крыўдзе ён работнікаў фабрычных, а так-жа й вясковых, і дзеля гэтага маўчком работніцкай справы мінуць ня можна. Да таго-ж, як гэта выглядае з дасюлешняй дыскусіі, абноўленая БХД будзе мець на ўвазе ня толькі сучаснасьць, але ў роўнай меры — калі ня больш — так-жа й будучыню. У будучыні-ж не даць эньваць работніцкага пытаньня будзе немагчымым і затым, што лік нацыянальна сьведамых беларускіх работнікаў будзе значны, бо гэтая сьведамасьць усьцяж сярод работнікаў адбываецца, а так-жа й агулам лік работнікаў будзе ўзрастаць з узростам на Беларусі фабрычнай прамысловасьці.

Урэшце абноўленая БХД павінна быць збудавана так, каб яна ня крыўдзіла ніякай грамадзкай на Беларусі клясы, але каб згодна ўлажыла іх сужыцьцё, каб усіх справядліва бараніла інтарэсы дзеля агульнанароднага і агульна-грамадзкага дабра.

Сутнасьць работніцкай справы ў тым, што капіталіст (фабрыкант, пан, часам багацейшы селянін) выкарыстывае й крыўдзе тых людзей, якія прадаюць ім сваю працу. Справа гэта сяньня ўжо настолькі сталася яснай і балючай, што паявіліся розныя пляны і тэорыі разьвязкі яе. Сярод іх бязумоўна найбольш яркае месца займае соцыялізм, і яго родны сын — комунізм. Гэтыя кірункі грамадзкай думкі работніцкую справу разьвязваюць даволі проста. Яны не прызнаюць нацыі і касуюць усякую прыватную ўласнасьць — нават ад дробных сялян адымаюць зямлю, — каб гэтым самым адняць людзям магчымасьць адным адных выкарыставаць і крыўдзіць. Расейская аднак практыка паказала й паказвае далей, што гэткая разьвязка работніцкай справы фактычна разьвязкай не зьяўляецца. Соцыялізм і комунізм у практыцы нясе тое, што кучка работнікаў фабрычных, як больш разьвітых і сьведамых сваей справы трымае дыктатарскую ўладу над усім народам. Знача, пры соцыялізьме ці комунізьме паказваецца як-бы другі бок капіталізму. Пры капіталізьме кучка капіталістых кіруе ўсім і ўсімі, а пры соцыялізьме ці комунізьме гэта-ж самае робіць кучка работнікаў.

Словам, соцыялізм з комунізмам работніцкай справы на Беларусі, дзе пераважаючая большасьць сялянства, справядліва не вырашае. Тут, знача, трэба шукаць іншай разьвязкі гэтай справы, разьвязкі больш адпаведнай характару і патрэбам беларускага народу, разьвязкі больш сучаснай і справядлівай.

Паводле маей думкі работніцкая і агулам справа соцыяльная на Беларусі павінна быць вырашанай больш-менш у наступным сэнсе.

Салідарнасьць работнікаў, сялян і інтэлігенцыі на беларускім нацыянальным грунце.

Не дыктатура работнікаў над сялянамі, а соцыяльная салідарнасьць на падставе справядлівасьці.

Імкнуцца да таго, каб не пролетарамі рабіць людзей, а ўласьнікамі: а) сялянскіх работнікаў надзяляць зямлёй на ўласнасьць, а фабрычных рабіць уласьнікамі фабрыкі, а так-жа імкнуцца да таго, каб і фабрычных работнікаў надзяляць зямлёй, дзе-б яны маглі мець прынамсі гарод і пабудаваць сабе хату.

Для работнікаў фабрычных бараніць:

a) 8-гадзінны дзень працы;

b) права страйку, як абарону ад вызыскаў, і права проф. саюзаў;

c) колектыўныя ўмовы дзеля забясьпечаньня лепшай аплаты;

d) забарону ночнай працы (вынятак там, дзе вымагаюць варункі тэхнічныя, або патрэбы грамадзкія);

e) забарону працы шкоднай здароўю жанчыны,

f) забарону працы дзяцей у фабрыках да 16 гадоў;

g) дзяржаўнае страхаваньне работнікаў гораду і вёскі ад хваробы, калецтва, безрабоцьця і на старасьць;

h) законнае прызнаньне фабрычных работніцкіх камітэтаў з правам учасьця іх у наглядзе за прадукцыяй і даходам у фабрыках, якія перайшлі ў колектыўныя формы валаданьня;

i) нядзельны адпачынак;

j) праўную апеку над працоўнымі на зямлі, у фабрыках і над хатняй службай — адумысловым уставадаўствам.

А ўрэшце, што да назовы абноўленай БХД, дык не бяруся яе прапанаваць, бо было іх столькі — і да таго некаторыя з іх даволі добрыя, — так, што прэзыдыюм БХД сам з іх лёгка выбярэ найбольш адпаведную.

Аўгень Л—іч.

А. Пінчук.

Сучаснае палажэньне беларускай вёскі.

Аб сучасным палажэньні беларускай вёскі, пасьля гэтага артыкулу, будуць друкавацца артыкулы аб: 1) Сялянскіх гаспадарках, 2) Мэдыцынскай помачы, 3) Асьвеце і 4) Арганізацыі.

Рэдакцыя.

I. Зямельнае пытаньне.

Сапраўды, сучасны стан беларускай вёскі проста жудасны: зямельная цесната, беспрацоўе і недахоп самага патрэбнага ў жыцьці, якое прымае першабытны характар.

Калі ў прадваенныя часы былі ўсякія магчымасьці да адыходу з вёсак лішніх рабочых рук — у цэнтральную Расею, Сібір, Амэрыку і г. д., — то цяпер гэтая магчымасьць прапала зусім.

А людзі штогод прыбываюць. Штогод прыбываюць тысячы новых грамадзян, якія патрабуюць заводзіць сваю асобную гаспадарку і закладаць сям'ю, але вонкавыя абставіны стаяць ім на перашкодзе.

Ужо цяпер даецца заўважыць, што сама вёска, асабліва моладзь, выразна адчувае гэтакі ненармальны стан рэчаў. Яна кідаецца на ўсе бакі, каб нейдзе зарабіць грош і каб навучыцца нейкага рамясла, або іншага фаху.

Але ўсё надарэмна...

Аказваецца, што заклікі да фаховай навукі і працы — напрасныя. Майстры не бяруць да сябе новых людзей нават дарма, бо самі сядзяць бяз працы, а ўрэшце, за кожнага працаўніка ці вучня трэба плаціць падатак у Касу Хворых.

Гэтакім чынам, сілы моладзі не выкарыстоўваюцца і яна сядзіць бяз працы, дэмаралізуючыся і трацячы веру ў лепшую долю. Не патрэбна яна і на ральлі, якая дзеліцца без канца, у выніку чаго большасьць гаспадарак прымае карлаватыя разьмеры і абыходзіцца мінімальнаю колькасьцю працоўных рук.

Працэс раздрабленьня сельскіх гаспадарак узмоцніўся за апошнія гады дзякуючы яшчэ таму, што ў Польшчы існуе закон, паводле якога дочкі і сыны атрымліваюць роўныя часткі спадчыны, калі іх бацькі памёрлі пасьля 1922 году. Гэты закон давёў, між іншым, да безканечных судоў, якія дорага каштуюць сялянам. З сумам трэба прызнаць, што з кожным годам пагаршаючы гаспадарчы стан нашай вёскі стварае падатны грунт для бальшавізму.

Бязумоўна, каб у свой час была праведзена шырская зямельная рэформа, і ўся абшарніцкая зямля перайшла ў рукі сялянства — сучасны эканамічны крызыс ня толькі на вёсцы, але і ў гарадох, ня меў-бы гэтакіх вострых формаў. Варта адцеміць, што пасьля сусьветнай вайны амаль усе эўрапэйскія народы зразумелі гістарычную неабходнасьць зьдзейсьненьня радыкальных аграрных рэформаў.

Гэтак, напрыклад, толькі да 1 студзеня 1926 г. распарцэлявана абшарніцкай зямлі: у Румыніі — 2.921 000 гэкт., у Латвіі 1.110.000 гэкт., у Эстоніі 895.000 гэкт., у Літве з 3000 маёнткаў перайшло сялянству 2000, а за гэты самы час у Польшчы з яе 30-ці мільёнавым, пераважна сялянскім, жыхарствам распарцэлявана ўсяго толькі 371 000 гэктараў.

Пры гэтым трэба памятаць, што ўся распарцэляваная ў Зах. Беларусі зямля дасталася пераважна польскім асаднікам. (Статыст. дадзеныя ўзяты з кн. Студніцкага „Przewroty i reformy agrarne").

У выніку гэтакай аграрнай палітыкі Польшчы мы маем сучасны стан нашай вёскі, які дабра не варожыць, — нашае сялянства заганяецца ў кабалу.

Здавалася-б, — добрая і карысная рэч хутары. Аказваецца, аднак, што ў большасьці выпадкаў людзі на іх перайшоўшыя згалелі і залезьлі ў неаплатныя даўгі.

Пераход на хутары патрэбны і гэта кожны разумее, але хутарызацыя павінна быць з прырэзкай зямлі і з выдатнаю дапамогаю.

У гэтым ня было-б нічога соцыяльна несправядлівага, бо ведама, што зямля ёсьць асноваю ўсяго жыцьця і ўпарадкаваньне карыстаньня ёю ёсьць першым абавязкам кожнай аграрнай краіны.

Трэба не запамінаць, што мы маем справу з правамі прыроды. Людзі, што родзяцца і вырастаюць, мусяць жыць, а раз так, то павінны мець і варштаты працы. Калі-ж іх няма ў патрэбнай колькасьці — немінучая соцыяльная катастрофа. Так заўсёды было ў гісторыі народаў, і гэтак будзе й далей.

Армія безпрацоўных з вёсак, пазбаўленых такіх варштатаў, усьцяж павялічваецца і, хаця яе ніхто не падлічвае, аднак можна з пэўнасьцю сказаць, што на адных толькі заходн. беларускіх землях яе набярэцца некалькі сот тысяч. Ня гледзячы на падобны стан рэчаў, аб аграрным пытаньні польскія палітычныя партыі „турбуюцца" для нашага Краю, звычайна, толькі перад выбарамі ў Сойм. Вось і сёлета, пэўне-ж, мы ізноў пачуем шмат прыгожага на гэту тэму.

Але ўжо ведаюць беларусы, што пасьля іхніх слоў, дзела чакаць ня прыходзіцца.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

Pastanowy Centralnaha Uradu B. I. H. i K.

I. Dnia 4.III. s. h. adbyłosia pasiedžańnie *Centralnaha Uradu* Bieł. Instytutu H. i K., na katorym byli pryniaty rezalucyi zborkaŭ dziela pracy nad čyściniej biełaruskaha jazyka. Rezalucyi hetyja pastanoŭlena padać da publičnaha wiedama.

II. Na hetym-ža pasiedžańni pastanoŭlena sklikać ahulny hadawy schod Rady Instytutu na 31.III. s. h. na hadzinu 6 uwiečary ŭ pamieškańni Instytutu. Pažadana było-b, kab hurtki BIHiK, jakija znachodziacca bližej Wilni i naahuł jakija mohuć wysłać pa 1 delehatu ad hurtka, prysłali na hety čas swaich pradstaŭnikoŭ, kab pryniać udzieł u ahulnych naradach.

* * *

Miadźwiedziči, Baranawickaha paw. Dnia 17.II.1935 h. adbyłosia ahulna-siabroŭskaje sabrańnie Miadźwiedzickaha Hurtka Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury, z hetakim paradkam dnia:

1) wybary staršyni sabrańnia, 2) adčytańnie pratakołu apošniaha sabrańnia, 3) sprawazdača z dziejnaści hurtka za 1934 h., 4) pierawybary ŭradu Hurtka, 5) plan pracy na budučyniu, 6) wolnyja prapazycyi.

1) Sabrańnie adbyłosia ŭ prysutnaści 12 siabroŭ, jakoje adčyniŭ staršynia Uradu Hurtka J. Tatarynowič, jaki pa adčytańni paradku dnia zaprapanawaŭ wybrać staršyniu sabrańnia, padajučy jak kandydata hr. J. Saroku, na što sabrańnie adnahałosna zhadziłasia. Staršynia sabrańnia, abniaŭšy kiraŭnictwa, paklikaŭ na sekratara J. Bubienčyka i prystupiŭ da dalejšych punktaŭ paradku dnia.

2) Pratakoł ahulnaha siabroŭskaha sabrańnia za 1934 hod adčytaŭ sekratar J. Bubienčyk, jaki sabrańnie pryniało da wiedama.

3) Sprawazdaču z dziejnaści Hurtka za minuły hod zdaŭ ad imieni ŭradu Hurtka staršynia ŭradu Hurtka J. Tatarynowič, z čaho sabrańnie dawiedałasia, što ŭrad adbyŭ u praciahu hodu 4 pasiedžańni ŭradu Hurtka. Pradstaŭleńnia nia złdziŭ niwodnaha z pryčyny niastačaŭ matarjalnych. Złdzili adnu akademiju, na katoraj byŭ pračytany referat p. zah. „Akt Abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi dnia 25.III.1918 h. Referat pračytała stud. Michalina Tatarynowič. Hurtok staraŭsia jak najbolej pašyrać biełaruskaje drukawanaje słowa. Siabry Hurtka źbiralisia što-niadzielu na supolnaje čytańnie biełaruskich hazet i knižak. Hurtok wioŭ samaadukacyju niahramatnych. Bibliateka pracawała dobra, knižki prychodzili brać z akaličnych wiosak za wiorst 12, tolki biada naša, što mała majem knižak, kasa maje deficyt z pryčyny nierehularnaha ŭnošańnia siabroŭskich sładak za minuły hod. Hurtok padaje da wiedama, što z pryčyny ciažkaha matarjalnaha pałažeńnia siabroŭ kasuje zalehłuju składku z minułaha hodu, adnačasna zaklikajučy, kab składku za biahučy hod uniaśli ŭsie abawiazkawa.

4) Urad Hurtka na biahučy hod wybrany toj samy, h. zn. staršynia Jazep Tatarynowič z Kuršynawič, wice-staršynia—Janka Saroka z Miadźwiedzič, sekratar — Janka Bubienčyk i skarbnik — Stanisłaŭ Karšun z Hajnina.

Układajučy plan pracy na s. h., pastanoŭlena ŭ mieru mahčymaści ładzić pradstaŭleńni, adčyty, wiaści supolnaje čytańnie knižak i hazet, wiaści samaadukacyju miž niahramatnymi, jak starejšymi tak i maładziejšymi, a tak-ža wučyć dziaciej u wieku školnym biełaruskaj hramaty. Pastanoŭlena ŭparadkawać lepiej biblijateku, spahnać wydadzienyja knižki i prywiaści ich u naležny paradak. Pastanoŭlena paprasić u Centrali, kab wysłała nam bolš knižak; kali možna, to darma, a kali nie, to choć na wypłatu, kab dapoŭnić biblijateku. Na hetym sabrańnie zakončana.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а гдзеўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

Prykład dla biełarusaŭ.

(Adhałoski światkawańnia Litoŭskaj Niezaležnaści).

Kožny hod 16.II litoŭskaje hramadzianstwa ŭ Wilni ŭračysta światkuje ŭhodki Niezaležnaści Litwy. Sioletniaje światkawańnie wyšła niejak asabliwa ŭračysta.

Ale nia ŭ hetym sprawa, dy ab hetym užo pisałasia ŭ wadnym z papiarednich numaroŭ. Tut naleža źwiarnuć uwahu na toje, ci i jak światkuje Niezaležnaść Litwy litoŭskaje sialanstwa našaha kraju.

Woś ža sialanstwa heta, jak było widać z litoŭskich wilenskich hazet, dzień swajho najwialikšaha nacyjanalnaha światа, u mieru swaich mahčymaściaŭ, zaŭsiody światkawała tak ža, ale sioleta jano wykazała ŭ hetym kirunku asabliwuju dziejnaść.

Z Nr. Nr. 16, 17 i 18 „Viln. Rytojus“ widać, što litoŭskaje sialanstwa i litoŭskaja sialanskaja intelihiencyja ŭ sioletnim hodzie dzień 16.II światkawała ŭ 47 miascoch Wilenščyny i častkowa Horadzienščyny. U henych 47 miascoch adbywalisia zborki, ładzilisia ŭračystyja wiečaryny, pradstaŭleńni i referaty, pryświačanyja dniu Litoŭskaj Niezaležnaści. Pry tym treba wiedać, što mnoha było miascoŭ, dzie litoŭcy nia zdoleli ŭ heny dzień arhanizawać swajho światа z wiedamych usim pryčyn.

Hetkaja dziejnaść litoŭskaha sialanstwa ŭ dzień litoŭskaha nacyjanalnaha światа sapraŭdy wymoŭna świedča ab wialikaj užo jaho nia tolki nacyjanalnaj, ale tak-ža i palityčnaj świedamaści.

* * *

Nadychodzić dzień 25.III, dzień ideału Biełaruskaj Niezaležnaści, dzień biełaruskaha nacyjanalnaha światа. Niachaj-ža biełarusy biaruć prykład z litoŭcaŭ, niachaj jak biełaruskija wiaskowyja arhanizacyi, tak i paasobnyja biełaruskija sialanskija dziejačy, parupiacca ab tym, kab dzień 25.III, u mieru sił i mahčymaściaŭ, kali nie adświatkawać, dyk choć naležna ŭspomnić.

P. Ł.

Успамін аб М. Ф. Блёдухо.

Даведаўшыся з „Бел. Крыніцы“ аб сьмерці акадэміка М. Ф. Блёдуха, хачу падзяліцца з чытачамі ведамым мне аб нябошчыку.

Пазнаёміўся я з М. Ф. Блёдухо ў 1918 годзе ў далёкім Алтаі ў Сібіры, куды быў загнаўшы нас лёс, падчас сусьветнай вайны. Там нас бежанцаў, было 24.000. Палавіна была з Горадзеншчыны. Ня ўсе былі ў адным мейсцы — былі параскіданы па ўсей Алтайскай обласьці. Пасьля расейскай рэвалюцыі ўсе народы арганізаваліся. Беларусы блыталіся па чужых арганізацыях, або трымаліся — ні сюды — ні туды. Там беларусаў было вельмі многа і многа нацыянальна сьведамых. Былі і такія, што гаварылі аб патрэбе сваей, беларускай, арганізацыі.

З ініцыятывы М. Ф. Блёдуха паўстаў Беларуска-Украінскі Камітэт помачы ахвярам вайны, а пасьля сарганізавалася Беларуская Грамада, кіраўніком і душой якой быў М. Ф. Блёдуха.

Пасьля заснаваньня Беларускай Грамады, з ініцыятывы М. Ф. Блёдуха, паўстаў гэтак зв. міжнародны камітэт бежанцаў у Сібіры, у які ўваходзілі: Беларусы, Літоўцы, Латышы, Украінцы і другія. Прадстаўнікамі ад Беларусаў у гэтым міжнародным камітэце былі: М. Ф. Блёдуха, С—скі і я. На паседжаньнях гэтага Камітэту гаварылася многа аб сужыцьці і дружбе гэтых народаў. Польская дэлегацыя вельмі соладка гаварыла аб дружбе з беларусамі, літоўцамі і украінцамі. Цяпер гэтага ня чуваць і ня відаць!

Цэнтр Беларускай Грамады быў у Барнауле. Праіснавала Бел. Грамада там год. Падчас вайны чырвоных з белымі ў Сібіры, Бел. Грамада была па загаду бальшавіцкага „губрэвкома“ забаронена. Аднак у 1920 годзе, калі там чырвоныя з белымі ваявалі, адбылося гадавое сабраньне Бел. Грамады, на якім завочна быў выбраны на старшыню М. Ф. Блёдуха, які на гэтым сабраньні ня быў, бо быў далёка ад'ехаўшы часова.

Рэзалюцыі ў справе чысьціні беларускага языка.

Пачынаючы з гэтага нумару „Б. Крыніцы“, будзем друкаваць рэзалюцыі зборак дзеля працы над чысьцінёй беларускае мовы, або, бяручы зьявішчы нашай мовы з пункту навуковага, беларускага языка. Рэзалюцыі, друкаваныя тутака, маюць болей акадэмічна-дарыўчы чым сыстэматычны характар, а гэта затым, што рэзалюцыі прыймаюцца паводле ўнясеньня паасобнымі сябрамі і навуковага разгляду зборкамі розных зьявішчаў, якія здараюцца ў беларускай мове. Рэзалюцыі зборак былі перагледжаны Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры, ім пацьверджаны і паданы да публічнага ведама. Рэдакцыя.

Праграма працы над чысьцінёй бел. языка.

Праграма павінна адказываць заданьню і нашым магчымасьцям. Заданьнем ёсьць: a) ачысьціць мову ад чужых слоў, b) не дапусьціць новага засьмечаньня і c) уматываваць, умацаваць і пашырыць яе беларускі склад.

Вышменаванае заданьне будзе ўжыцьцяўляцца пры помачы гэткае працы:

1. Сыстэматычнага разгляду мовы беларускае прэсы і выдаваных кніжкаў, прычым мае зварочвацца ўвага ня толькі на заганы мовы розных выданьняў, але й на яе добрыя староны, каб першыя аддаліць, а другія пашырыць.
2. Адумысловага разгляду: a) асобных словаў, b) памагчымасьці найчасьцей ужываных спэцыяльных тэрмінаў, c) фонэтычных, морфолёгічных і сынтаксычных хвормаў, каторыя або трэба аддаліць, калі яны чужыя, або пашырыць, калі яны свае собскія, беларускія, зварочуючы найчасьцей увагу на такія словы й хвормы, якія сустракаюцца ў нашай кніжнай мове.
3. Азнаямленьня з гутаркамі беларускае народнае мовы пры помачы этнографічных запісаў і беспасярэдніх гутаркаў паміж учасьнікамі.
4. Азнаямленьня із старой беларускай моваю літаратурнай.
5. Азнаямленьня з моваю некаторых памяткаў беларускага языка.
6. Як адзін з важных рэзультатаў працы, павінна быць прыгатова да выданьня слоўніка прынятых словаў, і зборнічка прынятых пастановаў аб словах і хвормах.

Рэзалюцыі, прынятыя 2.II.35 г. на зборцы дзеля працы над чысьцінёй беларускага языка.)*

1. Ёсьць слова **цьвет**, але **цьвісьці — цьвіту**, а ня „цьвясьці — цьвяту“ (з *і* па *в*); мясцовая хворма ад цьвісьці — *цьвію, цьвіеш* і г. д. найчасьцей ужываецца для азначэньня плесьненьня (хлеб *цьвіе*). Ня ўсе расьліны цьвітуць і цьвітучы маюць цьвет, часьць расьлінаў (прыкл.: жыта, пшаніца, мятліца) **красуе** (мясцовая хворма — *расуе*) і **красуючы** (мясцовая хворма — *расуючы*) мае **красу** (мясц. *расу*). Расьліны, што цьвітуць, або завуцца **краскамі**, як рожа, латаці, пралескі і інш., або ў часе **цьвіценьня** маюць на сабе краскі, як яблына, ліпа, клён, бэз і інш. Мясцамі краску завуць *кветкаю*. Як маем „цьвет“, але „цьвісьці-цьвіту“, таксама маем **сьвет**, але **сьвітаць-сьвітаю** (з *і* па *в*).
2. Беларуская хворма ёсьць **мяккі** (з двума *кк*), **мякенькі, мякчыня**, а не „мягкі“ і г. д. — з *г*, як у мове расейскай.
3. Мае ўжывацца **цяпліня** (з *і* па *л*), а не „цяплыня“; маем у гэтым слове суфікс (устаўку) — **іня** (прыкл. **глыбіня**) і толькі па ацьвярдзелых *р, ж, ч, ш* „*і*“ перайшло ў „*ы*“ (**шырыня, даўжыня, велічыня**).

Рэзалюцыі, прынятыя на зборцы 11.II.35 г.

1. У імёнах зборных (гальлё, нажжо і інш.), дзеяслоўных (жыцьцё, чытаньне), нярэдка ў іншых хвормах назоўных імёнаў (судзьдзя), у неазначаным ладзе (судзіцца), у трэцяй асобе цяперашняга часу абодвых лікаў (ён судзіцца, яны судзяцца) маем у беларускім языку здваеньне сугукаў (зычных). Ня бывае здваеньня *р* (зьвяр'ё, надвор'е) і вусьняных сугукаў (дуб'ё, куп'ё, сям'я, снапоўе, праваслаўе). Кожны з іншых сугукаў ня мае здваеньня тады, калі перад ім ёсьць інакшы сугук, напр.: сьмяцьцё, але лісьцё, хусьце; судзьдзё, але жардзё, порце; кажацца, паддацца, але ён дасца, удасца, паддасца).
2. Перад пачынаючым склад націсьненым *о* заўсёды бывае прыстаўное *в* (воглядка, вобуй, вошчупкам, востры, возера, восень, восенскі, вобад, волава, воцат, Лявон, восвы, вокны, войча і інш.). Перад *о* ненацісьненым або — інакш кажучы — перад гукам *а*, які паўстаў з ненацісьненага *о*, прыстаўнога *в* блізу што ніколі ня бывае (аглядацца, абувацца, ашчупываць, астрабрамскі, астрог, азярцо, асянчук, абады, алавяны, альховы, альшэўнік, асва, акно, ацец і інш.). Перад гукам *а*, што паўстаў з ненацісьненага *о*, прыстаўное *в* можа быць толькі ў вынятковых прыпадках, зьяўляючыся па аналёгіі да тых хвормаў, дзе *в* бывае перад *о* націсьненым; гэтак напр: магчыма **вастрыць** пад уплывам хвормы 3 ас.: ён вострыць.
3. Перад пачынаючым склад націсьненым *у* заўсёды ёсьць прыстаўное *в* (вушы, навука, вуліца). Перад пачынаючым склад ненацісьненым *у* бывае прыстаўное *в* тады, калі *у* паўстала з праславянскага *юса* (вусаты, вуда, вузёл, вузлаваты, вужака, вузіня, вугор і інш.); у гэткіх прыпадках беларускае *ву* адпавядае польскаму *wą, wę* (wąsaty, węzeł, wąski і інш.). Перад націсьненым *у*, непаўсталым з *юса*, у вадных прыпадках бывае *в* (вучыцель, вушак і інш.), а ў другіх ня бывае (умець, учыніць, ужо), дзе ў такіх прыпадках ёсьць *у, ў*, а дзе *ву* — пазнаём з практыкі. Калі перад ненацісьненым *у* ня бывае *в*, дык *у* астаецца толькі па сугуку (ён умее), але па самагуку (галосным) пераходзіць у ў нескладовае (яна ўмее).
4. Па прыймені *у, ў* і па прыстаўцы *у, ў* бывае перад *а* (старадаўным і паўсталым з ненацісьненага *о* прыстаўное *в* (агонь, авёс, але „палена ў вагні“, „конь у ваўсе“; адзін чалавек—„былі ў ваднаго чалавека“, асоба—„увасабленьне“ і г. д.) Па прыймені *у, ў* прыстаўное *в* хоць і вымаўляецца ў собскіх імёнах (напр.: у Вадама), але ў собскіх імёнах яно ня пішацца (у Адама, у Амэрыцы).

Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

*) Прынятыя словы або хвормы агульна-беларускія друкуюцца грубымі літарамі, а провінцыяльныя (мясцовыя) — курсывам.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Канфіската. Па загаду віленскага Гарадзкога Старасты сканфіскаваны дня 6-га г. м. № 1 (11) часапісу беларускіх нацыянал-сацыялістаў „Новы Шлях."

Традыцыйныя бліны ў Інстытуце. Дня 4-га г. м. віленскі аддзел БІГІК зарганізаваў у сваей залі вечар — *традыцыйныя беларускія бліны з верашчакай.*

Віленскае беларускае грамадзянства, як старэйшае, так і моладзь, прыбыло на вечар у значным ліку. Забыўшыся клопатаў штодзеннага жыцьця, учасьнікі правялі супольна час радасна, у настроі. Аддзел Інстытуту накарміў танным спосабам (за мінімальныя складкі) прысутных ня толькі блінамі, але — галоўнае — прыгожымі беларускімі, пераважна народнымі, песьнямі, у выкананьні беларускага хору пад кіраўніцтвам інж. А. Клімовіча.

Вечар кончыўся скокамі.

Гадавы сход сяброў віл. Аддзелу БІГІК адбыўся дня 5-га г. м. Па справаздачы ўступаючага ўраду і зацьверджаньні яе сходам, сход выбраў новы ўрад Аддзелу, у складзе: старшыня — інж. А. Клімовіч, віцэстаршыня — В. Войтэнка, сэкратар — Ул. Казлоўскі, скарбнік — Я. Найдзюк, вольны сябра — А. Яцына.

Вечар прапаганды пчалярства і спажыцьця мёду. Дня 3 га г. м. адбыўся ў Вільні ў залі Літоўскага Студэнскага Саюзу (Віленская 28) вечар дзеля прапаганды пчалярскай справы.

Супрацоўнікі часапісу Беларуская Борць," на чале з грам. Л. Войцікавай, шмат папрацавалі і ўлажылі душы, каб зарганізаваць і паставіць на вышыню вечар. Праграма вечару, добра і ўдачна выканаая, складалася з: а) двух рэфэратаў: гр Л. Войцікавай („Кароткага нарысу гісторыі пчалярства") і студ. М. Якімца („Аб спажыўных і лекарскіх вартасьцях мёду"), в) адчытаньня адрыўкаў з літаратуры славянскіх народаў (беларускай, украінскай, польскай і расейскай) аб пчале і 3) з выкананьня хорам гр. Р. Шырмы некалькіх народных песьняў. Вечар кончыўся скокамі.

З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Сэсія Беларускай Акадэміі Навук. Сёлета у студні месяцы адбылася ў Менску сэсія Беларускай Акадэміі Навук, прысьвечаная справаздачы за 1934 год, зацьверджаньню плянаў работ Акадэміі і іншых устаноў, не ўваходзячых у сыстэму Акадэміі, і выбару новага прэзыдыюму Акадэміі.

На сэсіі з дакладам — справаздачай выступіў прэзыдэнт Акадэміі Горын.

Паводле дакладу Горына, у 1934 г. у Акадэміі працавала 187 акадэмікаў, вучоных спэцыялістаў і старшых навуковых работнікаў; Акадэмія выдала 129 прац і навукова папулярных работ, якія даты чаць усіх галін соцыялістычнага будаўніцтва; Акадэміяй праведзены работы ў галіне геалагічнага вывучэньня БССР аграглебавага пакрову і г. д.; у галіне масавай работы адбыліся „значныя зрухі" — навуковымі работнікамі Акадэміі прачытаны на фабрыках, заводах і ў калгасах звыш 800 дакладаў.

Гаварыў дакладчык, што 1934 г. для Акадэміі праходзіў у ўмовах жорсткай барацьбы з „астаткамі" контрэвалюцыйных нацыянал-дэмократычных і троцкісцка-бундаўскіх элемэнтаў. Урэшце Горын падчыркнуў неабходнасьць узмацненьня клясавай пільнасьці і рашучага зжываньня гнілога лібэралізму, які яшчэ мае месца ў сьценах акадэміі.

У выніку дыскусіі над дакладам Горына, сэсія прыняла рэзалюцыю, у якой адзначаюцца работы Акадэміі у 1934 г.; зацьвердзіла плян работы на 1935 г., сьцьвердзіла, што „пасьпехі" Акадэміі могуць быць асягнуты толькі ў бязлітаснай барацьбе з усякага роду контррэвалюцыйнымі элемэнтамі, — у першую чаргу з беларускімі нацыяналістамі, якія ўсяляк імкнуцца пралезьці ў навуковыя ўстановы; сэсія зьвярнуцца ўвагу на патрэбу весьці няўхільную барацьбу за павышэньне якасьці навуковай прадукцыі, і запрапанавала інстытутам Акадэміі прыняць актыўны ўдзел у выданьні беларускай савецкай энцыклапэдыі.

Пасьля дакладу сакратара Акадэміі Панкевіча, сэсія зацьвердзіла галоўную тэматыку не ўваходзячых у сыстэму Акадэміі навукова-дасьледчых устаноў.

Урэшце сэсія выбрала новы прэзыдыюм Акадэміі, у складзе: П. Горын — прэзыдэнт, Т. Домбаль і Я. Колас — віцэпрэзыдэнты, Бурстын, Кулагін, Шчарбакоў, Вальфсон, Панкевіч, Ашаровіч, Шпенцэр і Чудзёнак — сябры прэзыдыюму. Новавыбраны прэзыдыюм Акадэміі СНК БССР у пачатку лютага зацьвердзіў.

У 1922 годзе я растаўся з М. Ф. Блёдухам — паехаў на Бацькаўшчыну, у Горадзеншчыну, а М. Ф. Блёдуха астаўся ў Сібіры кіраўніком сіб.-залатым трэстам. Нябошчык усьцяж мрыяў аб пераезьдзе на жыцьцё ў Менск і стараўся, каб яго з Сібіры перавялі на Беларусь.

У 1918 годзе М. Ф. Блёдуха быў кіраўніком Алтайскім горным округам. Ён меў багатую калекцыю мінэралаў, ня толькі сібірскіх, але і з іншых краінаў. Нябошчык хацеў гэтую калекцыю мінэралаў перавесьці ў Менск. Ці ўдалося яму гэта, — ня ведаю.

Пішачы гэты ўспамін, глыбока ў сэрцы сумую і праймаюся жалем з прычыны сьмерці Дарагога М. Ф. Блёдуха.

Дзядзька В.

Ялаўка, 26.II.1935.

Premjer Kazłoŭski ab palepšańni doli ziemlarobstwa ŭ Polščy.

U kancy lutaha, na pasiedžańni Senatu, premjer Kazłoŭski skazaŭ wialikuju palityčnuju pramowu, u jakoj pradstawiŭ ahulnaje haspadarčaje pałažeńnie Polščy, padčyrkiwajučy ŭ asobnaści ciažkoje pałažeńnie ziemlarobstwa.

Premjer Kazłoŭski ćwierdzić, što ŭrad staić na prawilnym šlachu ŭ baraćbie z haspadarčym kryzysam, bo pierakanany, što kryzys možna pieramahčy tolki swaimi siłami.

Praŭdu kažučy, natuhi ŭradu nie dali jašče pozytyŭnych rezultataŭ — kazaŭ premjer. Miž cenami fabryčnych wyrabaŭ i ziemlarobskaj pradukcyi raźbiežnaść wialikaja. Urad imkniecca da pawyšeńnia cenaŭ na ziemlarobskija pradukty i dziela hetaha šukaje dla henych praduktaŭ rynkaŭ zbytu. Ale hetyja starańni zamałyja, bo ziemlarob musić spłačywać raniejšyja daŭhi i dziela hetaha wypradaje swaje pradukty na spłatu daŭhoŭ, zmušajučy siabie da niedajadańnia.

Specyjalnaja finansawaja dziela addoŭžańnia kamisija pracuje nad abniženniem zadoŭžańnia ziemlarobstwa.

Abniziać samaŭradawyja padatki, bo byli źwierch siły sialanstwa. Adnačasna ŭrad budzie imknucca *da paniżeńnia cany na pramysłowyja wybary.*

Z pramowy staršyni ŭradu widać, što kiraŭničyja dziejniki ŭžo bačać patrebu pawyšeńnia dabrabytu ŭ Polščy, asabliwa dabrabytu sialanstwa.

Padatkawaje rasparadžeńnie.

Ministr skarbu wydaŭ zahad dakanać rewiziju dachodnaha padatku haspadarak, što majuć nižej 15 hektaraŭ ziamli. Z hetkich haspadarak dachodny padatak nie naležycca.

Nowaja polskaja partyja.

U Waršawie nahladajecca ruch u twareńni nowaj polskaj partyi „Narodnaja partyja pracy". Hetuju partyju tworać secesionisty Partyi Pracy, jakoj staršynioj byŭ praf. Bartel. Heta nowatwor maładych Be-Be-kaŭ na wybary.

Pawarot da prywatnaj ułasnaści ŭ SSRR.

Niadaŭna adbyŭsia ŭ Sawietach ahulna-sajuzny źjezd kałchoźnikaŭ — udarnikaŭ, na jakim pryniaty prykładny rehulamin dla ziemlarobskich arcielaŭ. Rada Kamisaraŭ i C. K. partyi hety rehulamin paćwierdzili.

Pastanowy rehulaminu pakazujuć, što balšawiki waročajucca da prywatnaj ułasnaści i robiać z kałchoźnikaŭ zwyčajnych dwornych parabkoŭ. Woś niekatoryja pastanowy rehulaminu.

Zhodna z zakonami rabotnicka-sialanskaj dziaržawy ziamla zakraplajecca dla arcieli na biezterminowaje karystańnie — nazaŭsiody — i nie padlahaje ani pradažy, ani arendzie. U kałchoznych dwaroch wyznačajecca dla kožnaha kałchoźnika niewialikija płoščy ziamli da 1 hektara na ŭłasnaje karystańnie asobna; kožny kałchoźnik moža mieć dla siabie asobna: 1 karowu, 2 štuki maładoj skaciny, 2-je świniej, z parasiatami, 10 awiec i koz, nieahraničanuju kolkaść kurej, wutak, husiej i krolikaŭ, a tak-ža da 20 wulloŭ pčołaŭ. U rajonach, dzie raźwita hadoŭla skaciny, možna mieć da 3 karoŭ."

Hetyja pastanowy sawieckija znaŭcy sielskaj haspadarki nazywajuć prahresam socyjalistyčnaha budaŭnictwa ŭ halinie sawieckaha ziemlarobstwa. A heta-ž zwyčajnyja normy dla dwornych parabkoŭ, ustanoŭlenyja pradwajennymi časami abšarnikami.

Pry hetym treba bačyć i adchileńnie kamunistaŭ ad socyjalizmu dy pawarotu da ŭłaśnictwa arcielnaha, jakoje raźmiakčajecca dalej indywidualnymi haspadaračkami ŭ kałhasach.

Wajskowy bunt u Hrecyi.

1 h. m. u Hrecyi zbuntawałasia wojska praciŭ uradu. Aficery — paŭstancy zachapili składy aružža i niekalka wajennych karabloŭ. Da paŭstancaŭ pryłučyłasia škoła kadetaŭ u Atenach. Nia ŭsio, adnak, wojska zbuntawałasia — astałosia mnoha pałkoŭ wiernych uradu. Zbuntawalisia addzieły, jakija byli pad upływami hienerała Płastirasa i wiedamaha dziejača Wenizelosa. Ciapier u Hrecyi abwieščana ŭradam wajennaje pałažeńnie. I sapraŭdy, tam wiadziecca ŭnutranaja wajna: wajujuć harmatami, kulamiotami i z araplanaŭ.

Pawadyrom rewalucyjnaha ruchu jość Wenizelos, jaki ŭ 1933 hodzie, paśla wybaraŭ u parlamant, nacyjanalistyčnaj partyjaj, pad pawadyrstwam Tsaldarisa, ad kiraŭnictwa Hrecyjaj i jaje palitykaj, jak unutranaj tak i ahulnaj, — adsunieny na bok.

Wenizelos staić na čale hreckaj liberalnaj partyi, jakaja ŭ narodnych masach maje słabyja ŭpływy; mocna trymajecca ŭ sferach wajskowych i ŭ sieradowiščy h. zw. „radykałaŭ". Wenizelos — heta wiedamaja na palityčnaj widoŭni Hrecyi asoba, kala jakoj krucicca praz bolš jak 30 hadoŭ hreckaja palityka.

Ułada ŭ Hrecyi, prad hetaj rewalucyjaj, była ŭ rukach partyi narodnaj, na čale jakoj staić Tsaldaris.

Pakulšto niawiedama, chto pieramoh — Wenizelos ci Tsaldaris.

Wincuk Adwažny. 31)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

VIII. Hdzie kryŭda, hdzie praŭda?

Jakraz kala hetaha času kurs uradawaj palityki na Biełarusi wielmi zawastryŭsia: usie čynoŭniki dastali ad hubernataraŭ patajnyja cyrkulary, u katorych byli dadzieny nowyja zahady, jak zmahacca z polska-katalickimi ŭpływami. Hubernatary asabliwuju ŭwahu źwiartali na ksiandzoŭ i prykazywali śladzić za ichnaj dziejnaściaj: ci nie wiaduć patajnych školaŭ? ci nie ahitujuć i ci nia robiać patajnych sabrańniaŭ pa wioskach? ci nie spawiadajuć byŭšych unijataŭ? i h. d.

— A kali-by hdzie što-jakoje-hetakaje akazałasia, — pisaŭ hubernatar, — dyk paduładnyja čyny pawinny zara stać na pieraškodzie i danieści ŭładzie wyšejšaj.

Wiedama, prawincyjalnaje čynawienstwa zara ŭziałosia za pracu.

Tymčasam u Murawancy prystaŭ Zarazaka zara prybieh z hetaj papierynaj da dziekana Kiškielisa, kab sakretna paradzicca ab supolnaj dziejnaści — „kab i uładzie dahadzić i pryjacielaŭ abaranić i siabie samoha abiaśpiečyć." Taksama radziŭ dziekanu pieraściérahčy swajho wikaraha i ksiandza Marcinoŭskaha ŭ Zawałacy.

— Hetyja dwa ksiandzy mianie zaŭsiody biespakojać, — hawaryŭ prycišanym hołasam Zarazaka: — jany, praŭda, maładyja i im treba mnoha darawać, ale .. jość, jak bačycie, na ŭsio hranica. Bo treba-ž wam wiedać, što ja tut u Murawancy nie adzin — uwajdziecie wy ŭ majo pałažeńnie! — takija samyja papieryny dastali tut i druhija čynoŭniki. Kali ja što spušču z wačej, dyk ubačyć heny ryžawusy inspektar Staniukiewič, a jon mnie zdaŭna nie dawiaraje. Ach, jak ja ryžych ludziej nie ciarplu! prosta — nie mahu na ich hladzieć: mnie woś tak i zdajecca, jak hlanu na ryžaha, što jon zara pačnie kusacca, ci jakoje druhoje licha tabie zrobić. Zatoje, jak papadu hdziekolečy takoha ryžaha złodzieja ŭ ruki, dyk, choć jon i ničoha nia ŭkraŭ, zadam jamu takoha čosu, što jon pośle za wiarstu mianie abychodzić! I hety inspektar Staniukiewič takisamy: kapajecca pada mnoj, jak krot pad kapustaj; a ja-ž taksama čaławiek... i na soncy, jak dobra pryhledzicca, jość plamy. Abo, wiedaješ dziekan? — hety naš tutejšy sudździa: jon tut ličyć siabie samym najstarejšym i najmudrejšym u cełaj Murawancy, a pa praŭdzie skazaŭšy — durny, jak bot dziurawy! Dyk wot widziš, ksiondz dziekan, z kim nam tut prychodzicca žyć u hetaj durnoj Murawancy. Nu, ale kaścioł budujcie sabie śmieła! Tolki lišnie nie marudźcie, bo chto z nas moža zhadać, što tam jašče wysokija ŭłady ŭ Piecíarburzie zadumajuć? Mohuć nam siudy prysłać jakoha nowaha rawizora — bukwajeda, a tahdy my prapali!

— A jašče horš, kali taki rawizor bywaje ŭ akularach, — padžartawaŭ dziekan, — tahdy ad jaho ničoha nie schawaješ.

— Ja nie bajusia takich, što zaŭsiody chodziać u akularach, — kazaŭ Zarazaka: — heta abo ślapawatyja, abo durnawatyja, ci fanaberystyja: takija ŭsiudy lezuć, mnoha haworać, ale ničoha nia bačać. A woś najhoršy taki, što pierš prysiadzie da papieraŭ, a tahdy ŭžo ciahnie z kišani akulary. Adzin taki čuć mianie kališci nie zajeŭ na śmierć: ščaście, što byŭ jon z sakratarom; dyk ja tolki ad taho dawiedaŭsia, jak jahonaha hada — načalnika možna padmazać i z katoraha kanca pačynać. Kaštawała (pamiž nami haworačy!) cełuju tysiaču, i sakrataru paŭtary sotni: ja tahdy dobra zalez u daŭhi, zatoje wyputaŭsia z taho skandału. Ato, wiedaješ, dziekan, jak zalez jon u maje papiery, načapiŭšy tyja praklatyja akulary i jak staŭ tyja papiery raskładywać, dyk prosta | ja dumaŭ — jon źwichnuŭsia: što nia woźmie papierynu — čytaje-čytaje i plaś jaje na stoł! „Tut, kaža, try hady turmy!" A pry druhoj — „piać hadoŭ!"... Tam iznoŭ try, a pośle i cełych dziesiać. Ja heta słuchaju, a z mianie až pot šybaje. „Nu, dumaju sabie, prapaŭ, jak padkowa ŭ bałocie!" I zašto mnie cełych dziesiać hadoŭ

Roznyja wiestki.

„Padieł jedinoj niedielimoj Rosii". Rasiejskaj emihracyi, što ūciakła ad balšawikoū, najbolš znachodzicca ū Francyi. Hetyja niaščasnyja ludzi ūściaž čakajuć mahčymaści pawarotu na baćkaūščynu i dziela hetaha šumna operujuć papiarowymi kličami, jakija datyčać i sprawy adradžeńnia Biełarusi.

Nadowiačy ū Paryžy pračytaū palityčny referat wiedamy rasiejski hienerał Denikin, jaki, miž inšym, skazaū, što imkneńni na ūschod Niamieččyny nia jość pachodam prociū balšawikoū, a dziela padzielu Rasiei. Dziela hetaha Denikin ciapier nia radzić rasiejskaj emihracyi padtrymliwać prociū-balšawickija wonkawyja imkneńni.

Woś ščaście kamunistaū: — Sawietaū ciapier baroniać nia tolki kamunisty ūsich krajoū, ale i b. carskija rasiejskija hienerały. Baroniać „jedinoj niedielimoj Rosii" razam z hien. Denikinam i biełaruskija kamunisty, što adhawarwajuć biełarusaū ad idei poūnaj niezaležnaści Biełarusi.

Z POLŠČY.

Upadak ziemlarobstwa. „Państwowy Instytut Naukowy Gospodarstwa Wiejskiego" niadaūna abwieściū statystyčnyja dadzienyja ab płatazdolnaści sialanskich haspadarak u Polščy. Henyja dadzienyja pakazwajuć, što ū sialanskich haspadarkach ad 1928 h. da 1932 h. źmienšyūsia dachod na 62 procanty. U 1927 h. siaredniaja sialanskaja haspadarka, pa adličeńni na ūtrymańnie siamji, mieła 200 zł. dachodu—na spłatu daŭhoū i palepšańnie haspadarki; u 1933 hodzie hetaja haspadarka maje niedachop 70 zł. na ūtrymańnie siamji.

Z hetaha bačym, što sielanin u Polščy nie zarablaje nawat na ūtrymańnie, paludzku, swajej siamji.

Z ZAHRANICY.

Padhatoūka da wajny Italii z Abisynijaj. Italjanski ūrad ūściaž pasyłaje swajo wojska ū Afryku i hetak hatowicca da wajny z Abisynijaj. Abisynija majučy paddzierżku nie baicca Italii i taksama hatowicca pawajawać. Cikawaje źjawišča: — Hreki z 12 wostrawaū, što pryłučany da Italii mirnym dahaworam, źwiarnulisia da cara Abisynii z prośbaj pryniać ich, jak achwotnikaū, u abisynskuju armiju.

Sporam Italii z Abisynijaj mocna cikawicca i niepakoicca Anhlija, bo ū Afrycy znachodziacca nitki intaresaū i anhielskich.

Saara pry Niamieččynie. Zhodna z pastanowaj Lihi Narodaū pryniataj paśla plebiscytu ū Saary, Saara 1 h. m. pryłučana da Niamieččyny.

Hitleroūcy ū Aūstryi spynili dziejnaść. Apošnimi časami hitleroūcy ū Aūstryi spynili swaju dziejnaść, zajaūlajučy, što ciapier u Aūstryi taki ūrad, jaki daje mahčymaść raźwićcia narodnaha ruchu. Pryčyna hetaha adnak lažyć u inšym miescy — u palitycy mižnarodnaj.

Z WILNI.

Kirmaš na Kazimiera ū Wilni. Z daūnych adbywajecca ū Wilni na Kazimiera (4 sakawika) tradycyjny krajowy kirmaš. Na hety kirmaš źjaždžajucca sialanie z dalokich wakolic, a handlary z susiednich haradoū. Sioleta na kazimieraūski kirmaš pryjaždžali z usiej Polščy, — ułady dawali źnižku na prajezd čyhunkaj. Pryjaždžali i hitleroūcy z Niamieččyny.

Pratesty weksaloū. U m-cy lutym u wilenskim wajawodztwie zaprotestawana 1.458 weksaloū na sumu 1.232 tysiačy zł. Z hetaha widać niastača kapitału i słaby jahony abarot.

Wiečar ukrainskaj pieśni i narodnych tancaū. Hur ok Studentaū Ukraincaū U. S. B. ładzić dnia 8 sakawika 1935 h. a hadzinie 20 aj u zali Muzyčnaj Konserwatoryi (wul. Konskaja 1) *„Wiečar ukrainskaj pieśni i narodnych tancaū"*. U prahramie pieśni: Stecenka, Košycia, Leonjowiča, Dawyzowškoha, Artšmowškoho, Rudolškoho i druhich, u wykanańni choru, pad kiraūnictwam prof. Matwijca. Narodnyja tancy: „Hrečanyki", „Gonta", „Kołomyjka", „Arkan", „Kateryna", „Čumak", „Suchodolskyj", „Zaporižec" i dr., ułoźany Awramienkom pad kiraūnictwam hram. Malinowškoho.

U „Wiečary" prymajuć učaście salistki: p. Skoruk, p. Bantla i inš. pry akompanjamencie p. Zambžyćkaha.

Bilety ū canie ad 2 zł. 99 hr. da 49 hr. dastać možna ū kasie ū dniu imprezy ad hadziny 15-aj.

Piśmy z wioski.

Fantastyčnyja wieści.

Pružana. U našym pawiecie drenna žywiecca, tak jak i ūsiudy. Na wioscy halita strašennaja, adna załatoūka—heta wialikija i darahija hrošy. Nia hledziačy na ūsio, sekwestratary nie dajuć spakoju i zabirajuć, što tolki im papadzie ū wočy i nie piarečyć ustawam.

Na hruncie hetaj hality ū pawiecie pašyrajucca roznyja fantastyčnyja čutki. Apošnim časam napryklad razyjšłasia pa ūsim pawiecie wiestka, što možna wyjaždžać u Paūdniowuju Ameryku — u Uruhwaj. Byccam dačka cara Mikałaja ad balšawikoū uciakła z niejkim hienerałam u Uruhwaj i tam zakupiła miljony hektaraū pustynnaj ziamli. Nia majučy stolki narodu, uruhwajski ūrad byccam źwiarnuūsia da Prezydenta Polščy, kab toj daū jakija 7 abo 9 miljonaū narodu, kab tam ich pasialić. Prezydent byccam zhadziūsia i možna ūžo jechać, tolki da polskaj hranicy treba jechać na swoj košt, bo Polšč hrošaj nia maje, a ad hranicy pawiazuć u Uruhwaj za amerykanskija hrošy... Jašče kažuć, što ū Polšč majuć pryjechać, ci ūžo pryjechali, ahienty z Ameryki, jakija buduć pazyčać hrošy na prajezd, a potym ludzi, zajechaūšy na miesca, buduć hetyja hrošy spłačywać...

Jasnaja reč, što hetyja słuchi nie astajucca biaz wodhuku: ludzi pryciśnienyja biadoj wierać i šukajuć ahientaū. Niekatoryja nawat u Wilniu pisali ū hetaj sprawie. Mnohija kažuć, što kab tolki da hranicy na swoj košt, to pradali-b usio i pajechali-b, bo ūžo žyćcia niama...

Ciapier pytańnie, chto pešyraje hetyja wiestki? Z taho, što haworycca tut ab dačcy cara, možna zrabić wywad, što pašyrajuć ich rasiejskija manarchisty, jakim treba padniać u narodzie nadzieju, kali ūžo nie na ruskaha cara, to prynamsi na jaho dačku. Ale ūsia ważnaść nia ū tym, chto pašyraje, a ū tym, što narod hetamu ūsiamu wieryć i źbirajecca ūciakać z Polščy. Heta jašče raz świedčyć ab sapraūdy biazwychadnym pałažeńni našaj wioski.

Wiaskowy.

Pawodle atrymanych nami wiestak, hetakija słuchi ab emihracyi ū Ameryku pašyrany nia tolki u Pružanskim, ale i ū inšych pawietach, bo ciažkoje pałažeńnie ūsich prymušaje šukać wychadu. Adnak my ściwiardžajem, što ūsie hetyja čutki nia majuć pad saboju realnaha hruntu. Paru hadoū tamu byū prajekt wysyłać z rabotnickich rajonaū Polščy biezrabotnych u Peru (Paūdn. Ameryka), kudy nawat wyjaždžała specyjalnaja kamisija, ale dziela niastačy finansawych mahčymaściaū, a tak-ža trudnaści i dalečyni pierasialeńnia, hety prajekt zakinuli. Ciapier polskija kruhi, jak my užo pawiedamlali ū prošłym numary „B. Krynicy," kirujuć biezrabotnych da nas, na „Kresy."

Redakcyja

Polskaja intelihiencyja ū biełaruskaj wioscy.

Turhieli, kala Wilni. U našych wakolicach žywuć biełarusy i haworać pabiełarusku. Na paūdnia ad nas, —pad Klawicaj, kala Dziawienišak jość i litoūcaū — tam haworać palitoūsku. Papolsku ū hetych wakolicach ludzi nie haworać, bo niama tut palakoū. Palaki tut — element napływowy: čynoūniki, palicyja, wučyciali i ksiandzy.

Našyja ludzi ūžo adważniejuć i nie starajucca hawaryć da čynoūnikaū papolsku — haworać paswojemu, dyk u wołaści i palicyja adkazwaje pabiełarusku, tolki słuchaj.

Polskija wučyciali i ksiandzy, aprača swajej polskaj pracy—ū škole adny, a ū kaściele druhija,—starajucca šyryć polščynu i pa za škołami dy kaściołami, — namahajucca ūciahnuć našu moładź u polskija arhanizacyi. Heta im, adnak, nie ūdajecca,—moładź našaja da polskich arhanizacyjaū nieachwočaja! Nie zamaniwaje ū polskija arhanizacyi našaj moładzi i pawaha ksiandza. Pawaha polskich ksiandzoū u našaj moładzi žydzieńkaja — chiba tolki ū sprawach čysta relihijnych. A wučyciali tak i nie paśpieli zdabyć pawahi siarod našych ludzie.

K. Bajarski.

Wałasnaja rada za pašyreńnie ziemlarobskaj kultury.

Rakawa, Maładečanskaha paw. Naša wałasnaja rada ūžo pryniała budžet na 1935—36 hod. Wojt z sekratarom u prajekcie budžetnym byli ūstawiūšy na pašyreńnie ziemlarobskaj kultury tolki (adčepnaha) — 120 zł. Wałasnaja rada wyasyhnawała na hetuju metu — 1200 zł. Radnyja hetu swaju pastanowu matywujuć patrebaj fachowaha ziemlarobskaha instruktara, jaki-b sialanam čytaū lekcyi ab ziemlarobskaj kultury—wučyū lepš abrablać ziamlu. Niawiedama, ci zaćwierdzić hetu pastanowu Maładečanskaja pawietawaja nadzorčaja ūłada. Niekatorych pastanoū wałasnoj rady hetaja nadzorčaja ūłada, užo byli fakty, nie paćwierdziła i kasawała.

Janka Makar.

Цёмны куток.

Вёска Стахоўцы, Пастаўскі пав. Нашая вёска мае 43 хаты. Жыцьцё ў нас—што далей, то цяжэй. У нас усе праваслаўныя, каталікоў няма. Цёмны наш куток — кругом няма нідзе ніякай арганізацыі. Сьветлых людзей каля нас толькі чатыры асобы; яны ўмеюць чытаць; ахвотнікаў да чытаньня ёсьць многа, абы было што. Купляць кніжкі і выпісываць газэты няма яшчэ звычаю. Затое многа п'юць гарэлкі. Манаполька дарагая, дык п'юць дэнатурат. За буянства некаторыя сядзелі ўжо ў вастрозе.

У нас ёсьць польская школа, але з яе нам, беларусам, мала карысьці, дык аб ёй і пісаць ня буду.

Дарагая моладзь, выпісвай і чытай свае, беларускія газэты, кніжкі і прасьвячайся. Прэч цемра! Няхай загляне сонца і ў наша ваконца!

Стахоўчык.

Аб нашай моладзі.

Сімакова, Стаўпецкага пав. Мала каля нас ёсьць каталікоў; большасьць праваслаўных. Нясьведамыя беларусы-каталікі ўважаюцца за палякоў, а нясьведамыя беларусы-праваслаўныя — за рускіх. А гэта таму, што каталіцтва каля нас называецца „польскай верай," а праваслаўе—„рускай верай." Гэткіх паглядаў трымаюцца многія старэйшыя, многія і з пасярод моладзі. А гэтыя-ж пагляды зусім фальшывыя, бо каля нас і ў нашай вёсцы ўсе беларусы, а „польскай веры" і „рускай веры" зусім няма—ёсьць праваслаўе і каталіцтва.

Ёсьць у нас і сьведамая нацыянальна моладзь, якая горнецца да чытаньня кніжак і газэт, але гэткіх яшчэ мала; у большасьці нашая моладзь яшчэ „рускай веры" і ўважаецца „рускай." Словам, яшчэ многа цемнаты! Гэтыя, што па нясьведамасьці ўважаюцца за „рускіх," або за „польскіх" з кніжкамі і газэтамі не знаёмяцца—яны заўсёды шукаюць спосабу, каб дастаць гарэлкі і напіцца да дурнаты.

Моладзь, прасьвячайся, бо згінеш!

Пр—вы.

turmy, kali ja na tym intaresie zarabiū sam tolki dźwieście rubloū? „Tfu"! – dumaju sabie. Wiedama, byū ja tahdy jašče małady: saūsim nia ūmieū brać — tolki pačynaū naščupywać. O, ciapier niachaj jon sabie pryjaždžaje i niachaj sabie kładzie choć i dźwie pary akularaū, — treśnie jon, a praūdy nie dabjecca! Dyk woś jakija paradki ū našaj świato Rasiei, niama čym pachwalicca...

Tut Zarazaka krepka ūzdychnuū i zadumaūsia.

— Ale naahuł, — kazaū jon, — budźcie wy bolš aściarožny: nia leźcie ū prysak z hołymi rukami, asabliwa hety waš małady wikary. Ja baču — jon zara papadziecca...

— Wy tut baiciosia palakoū, — kazaū dziekan Kiškielis, — a moj wikary nie palak, a biełarus, — dyk wikaraha niama čaho bajacca. Prytym jon...

— Nu, heta nie wialikaja paciecha! — pierabiū Zarazaka i kisła uśmiachnuūsia, — bo, widzicie, ksiondz dziekan, jak tut wam skazać: palaki— heta ū nas takaja chwaroba, katoruju my dobra znajem i wiedajem, jak ad jaje baranicca: na palakoū my majem hatowyja paragrafy, pastanowy i ūsio takoje, a biełarusy... heta niešta — niejkaje — takoje, čaho my jašče nia znajem. Kab waš wikary byū niemiec, ci francus, ci choć z inšaha narodu, jakoha ū Rasiei niama, dyk niachaj sabie byū-by, kim chacieū-by, ale biełarus... Kali ūžo pryznawacca, dyk skažu wam usio, jak na spowiedzi: nam niadaūna hienerał-hubernatar na sabrańni prystawoū u Wilni skazaū:

— Słyšytie, pristawa? Nikakich w Wilenskaj gubiernii biełorusow nie dołžno być! Poniali? – Nu, my i paniali, čaho jon chacieū. Woś my tahdy ūhawarylisia ūsich takich biełarusaū ličyć za sacyjalistaū: hetak lahčej było padciahuuć ich pad paragraf i skrucić u barani roh. Ale waš wikary, značyć — ksiondz: dyk jak jaho siudy padciahnieš? Ja ūžo i sam nia wiedaju, što z im prydziecca zrabić. Lepš niachaj jon sam supakoicca!

* * *

A inspektar Staniukiewič, dastaūšy patajnuju papierynu, tak razahnaūsia, jak-by sieū na sto kaniej: cełaja sotnia planaū pryšła jamu zrazu ū hołaū, tolki biedny nia wiedaū, z čaho tut pačać. Pieračytywaū tuju papieru nieskalka razoū i ūśmiachaūsia sabie pad wus; pahładžywaū baradu i pachadžywaū tudy-siudy pa swaim salonie.

— N-da! — hawaryū jon sabie ū paūhołasie: — N-da! eto očeń chorošo. N-da! chotia i pozno, no zato kriepko. Už eti polački sliškom razošliś, n-da! no tiepier my ich zdzieržym. Che, che!

Nazaūtra inspektar adrazu prystupiū da dzieła: najpierš prykazaū sekrataru Maznyci napisać i wywiesić u škole nieskalka abjaūleńniaū: „Po-polski gaworit' wospreščajetsia!" choć tut jakraz nichto papolsku i nie hawaryū, bo sami wučyciali hawaryli pa rasiejsku, a wučni i škołny storaž — pabiełarusku.

Maznycia paprasiū (ad siabie) na pomač wučyciela Paūła Piatrowiča Piatuchowa, katory wielmi pryhoža pisaū. I woś Piatuchoū, skrywiūšy haławu, wypisaū wializarnymi litarami tuju zabaronu. Prytym adnak nie abyšłosia biaz pryhody, bo Piatuchoū, zadumaūšysia ab niejkich matyłkoch, narabiū mnoha pamyłak: na adnoj papiercy napisaū „sprieščajetsia!" na druhoj —„nie wosprieščajetsia!" na inšaj — słowa „po-Polski" napisaū wialikaj litaraj. Skončyłasia tym, što Maznycia sam napisaū usie hetyja abjaūleńnia: wyjšła nia tak pryhoža, ale biez pamyłak.

Pośle, sklikaūšy ūsich wučniaū, inspektar zabaraniū im piajać u kaścielnym chory pad pahrozaj wydaleńnia sa škoły, a ūsim śpiewakom prykazaū naležyć da carkoūnaha choru i piajać u cerkwie. I narešcie inspektar zajawiū, što nie dapuścić u swajej škole nijakich polskich intryhaū, bo—kazaū — „chto tut jość taki palak, dyk niachaj zaraz wychodzić sa škoły, dy jdzie sabie „do lasu!"

Wučni pahladzieli na taho adnaho palaka, katory byū u škole i uśmichnulisia. A Albinowič cichańka jamu skazaū: „Čuješ, Krencinski? idzi ty choć raz da taho lasu, bo my nia znajem tudy darohi i nia wiedajem, što tam rabić!"

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutewič